# ПЕСНАПЕННІ ПРАВАСЛАЎНАГА БОГАСЛУЖЭННЯ ЯК ІНТЭГРАЦЫЙНЫ КАМПАНЕНТ БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ канца XX – пачатку XXI ст.

***К. А. Чарнова,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, навуковы супрацоўнік Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі*

Разгляд рэалій беларускай музычнай культуры канца XX – пачатку XXI ст. сведчыць аб шырыні і інтэнсіўнасці праекцый сакральнага слова хрысціянскай царквы ў музычна-культурны хранатоп. Корпус гімнаграфічных тэкстаў праваслаўнага богаслужэння шырока запатрабаваны ўсімі слаямі/стратамі/«дыялектамі» (Б. Асаф'еў) беларускай музычнай культуры. Яго музычныя ўвасабленні паўстаюць своеасаблівай «культурай у культуры», што яднае розныя асяродкі духоўна-рэлігійнага і сацыяльна-культурнага музычнага жыцця Беларусі. Шматмерныя «праекцыі», якія сакральнае гімнаграфічнае слова набывае ў розных сферах беларускага музычна-культурнага жыцця, раскрывае традыцыю праваслаўнага спеву, па-першае, як асноватворную частку той з'явы, якая азначана М. Говардам тэрмінам «культурная арыентацыя» сфер грамадства, і, па-другое, як адзін з сістэмна значных кампанентаў беларускай музычнай культуры.

Песнапенні праваслаўнага богаслужэння (на ўзроўні корпуса гімнаграфічных тэкстаў) выступаюць адным з стрыжнёвых кампанентаў культуры, які вызначае ўсе яе «паверхі» і аб'ядноўвае шматлікія інтанацыйна-стылявыя сферы; выступаюць як цэласнасць, якая духоўна, функцыянальна, этычна і эстэтычна прасякае сферы культуры, інтэгруе інтанацыйнасць, прыналежную тапахрону храма, канцэртнай залы, шматлікім праявам этнамузычных практык, рэчышчам прафесійнай кампазітарскай творчасці.

Праваслаўная богаслужбова-пеўчая традыцыя на рубяжы стагоддзяў можа быць разгледжана на ўзроўні культурнага патэрна, які ў якасці дамінуючага кампанента выконвае інтэгруючую і сэнсавызначальную ролю, вядзе да ўнутранай цэлас-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

насці культуры і суладдзя паміж рознымі яе элементамі.[27] «Прысутнасць» праваслаўных песнапенняў можа быць прасочана фактычна на ўсім маштабе арэалаў духоўна-рэлігійнага і мастацкага жыцця – ад храма (рэаліі богаслужбовых практык на гарадскіх і вясковых прыходах) да канцэртнага выканальніцтва, вуснатрадыцыйных практык (абрадавы рэпертуар зімовага і Вялікдзенскага перыяду), кампазітарскай творчасці.

Храмавая богаслужбовая практыка. Характар музычнага напаўнення чыну праваслаўнага богаслужэння на беларускіх прыходах дае магчымасць бачыць не толькі рэпертуарныя традыцыі кліpасаў як своеасаблівыя «музычныя лікі» храмаў, але і ўсю шырыню пеўчых традыцый Рускай праваслаўнай царквы, якія нават у чарадзе лінейнай паслядоўнасці сваіх стыляў не маюць рэзкіх абрываў або поўнага адыходу ў нябыт. Музычная панарама, якая пры гэтым адкрываецца, паўстае настолькі багатай і рознай у сваіх стылявых адценнях, што змушае яшчэ раз унікнуць у сэнс таго руху, калі пеўчыя стылі, на першы погляд «аджыўшыя», не згасаюць (хоць на пэўны момант, здавалася б, страчваюць прыярытэтнасць), а працягваюць поўніць і глыбінна жывіць «нябачны фонд» праваслаўнай спеўнай культуры патэнцыяй вяртання ў абіходную практыку богаслужэння.

Асноўнае, што вызначае гукавую прастору гімнаграфічных тэкстаў, увасобленых у царкоўным спеве, – насычанасць рознымі пеўчымі стылямі, якія ў тапахроне храма ўступаюць у своеасаблівы «кантрапункт стыляў» (Д. Ліхачоў). На макраўзроўні «богаслужбова-пеўчай сістэмы» (І. Гарднер) апошні выяўляе сябе праз спалучанасць розных (для вясковага прыхода, гарадскога храма, манастыра) музычна-стылявых традыцый богаслужбовага спеву, суіснаванне ў богаслужэнні кліраснага спе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[27] Разгляд быцця песнапенняў праваслаўнага богаслужэння ў беларускай музычнай культуры на рубяжы XX–XXI стст. і іх інтэграцыйнай функцыі немагчымы без уліку фактара духоўнага адраджэння, праяўленага ў жыцці грамадства на піку 1990-х гадоў – «гарачай» (К. Леві-Строс) фазе агульнагістарычнага працэсу. У сітуацыі пераходу (па сутнасці пераўтварэння) таго, што на працягу сямі дзесяцігоддзяў XX ст. існавала амаль што ў латэнтнай форме («схаванае існаванне культурнай традыцыі» – Р. П. Підаль), у прадуцэнтна-актыўны стан, у факце вяртання «страчаных форм» культуры, кантакту з традыцыяй богаслужбовага спеву, новага і вельмі актыўнага запатрабавання гімнаграфічнай спадчыны немагчыма не адчуць цуд дзейнасці культурнага рэзанансу («рэзананс-фактару», паводле Э. Аляксеева), абуджэння глыбінных механізмаў культуры, непрасталінейных і, як усё генетычнае, непавярхоўных.

ву і практык саборнага прыходскога спявання, ажыццяўленне на сучасных беларускіх прыходах літургічнага чыну не толькі на царкоўнаславянскай, але і на беларускай мове. На мікраўзроўні сістэмы (у межах аднаго богаслужэння) музычна-стылявы кантрапункт абумоўлівае захаванне ў богаслужбовым чыне (у выглядзе фрагментарна здзейсненых улучэнняў) песнапенняў на грэчаскай мове, спалучэнне такіх гістарычна розных стылявых плыняў праваслаўнага богаслужбовага спеву, як знаменны манадыйны і шматгалосы партэсны, гарманійны. У выніку, нягледзячы на рознастылістычную скіраванасць песнапенняў, якія выкарыстоўваюцца ў богаслужбовых практыках прыходаў, музычна-стылявы кантрапункт выступае той намінатыўнай данасцю праваслаўнага храма, у гукастылявой прасторы якога раскрываецца жывое быцце гімнаграфіі, яе надчасовы сэнс як сакральнага слова, паралельна-аўтаномнага ў сваім існаванні з рознымі, цалкам прыналежнымі гістарычнаму часу, яго музычна-стылявымі ўвасабленнямі.

Канцэртнае выканальніцтва. Адраджэнне праваслаўнай традыцыі і яе музычных форм праявіла сябе праз цэлы комплекс з'яў. Яркай рысай беларускай музычнай культуры канца XX – пачатку XXI ст. з'яўляецца пазахрамавае (канцэртнае) выкананне песнапенняў праваслаўнага богаслужэння[28]. Актыўнасць практык пазахрамавага выкарыстання праваслаўных песнапенняў, у тым ліку тых, якія трывала ўсталяваліся ў богаслужбовым пеўчым чыне, – адметная рыса беларускай музычнай культуры сучаснасці. Праваслаўныя літургічныя песнапенні – важны складнік канцэртных праграм, стрыжань спецыяльных фестываляў-конкурсаў. Яны ўваходзяць у рэпертуар прафесійных і аматарскіх харавых калектываў, дзе пададзены рознымі гістарычнымі і індывідуальна-аўтарскімі стылямі, традыцыямі памесных праваслаўных цэркваў, мясцовымі напевамі асобных абіцелей.

Пазахрамавае канцэртнае выкананне праваслаўных богаслужбовых песнапенняў аказваецца на цяперашні час адной з трывала ўкаранёных форм іх існавання ў беларускай музыч-

[28] Неад'емнай часткай культурнага жыцця на Беларусі сталі радыё- і тэлетрансляцыі праваслаўных перадач, у якія ўключаюцца богаслужбовыя песнапенні. Характэрнай з'явай беларускага эфіру сталі спецыяльныя канцэрты так званай духоўнай музыкі. Запісы праваслаўных песнапенняў (а нярэдка і ўсяго пеўчага чыну богаслужэння) пачалі актыўна тыражыравацца на кампакт-дысках і аўдыёкасетах.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най культуры сучаснасці. Ацэнка гэтай з’явы з боку розных прадстаўнікоў грамадскасці неадназначная. У цэнтры дыскусій – пытанне карэктнасці выканання па-за храмам песнапенняў богаслужэння. Пастаўленае ў плоскасць суадносін сакральнае – прафаннае, яно мае стрыжнем разуменне таго, што ў тапахроне канцэртнай залы рэлігійныя сімвалы, закладзеныя ў вербальных і музычных тэкстах, знікаюць у той самай ступені, як знікаюць яны і ў іншых «перакладах» сакральнага на «мову культуры».

Вуснатрадыцыйныя песенныя практыкі: праваслаўныя песнапенні (у тым ліку богаслужбовыя) з’яўляюцца неад’емнай часткай свядомасці і непасрэдна рэпертуару носьбітаў беларускай музычнай культуры вуснай традыцыі. Яны маюць трывалае замацаванне ў спявацкай памяці, нават калі спевакі не з’яўляюцца пастаяннымі прыхаджанамі сельскіх храмаў. Кананічныя песнапенні (перш за ўсё трапары і кандакі) уваходзяць разам з карэннымі для носьбітаў этнічнай традыцыі песеннымі жанрамі і інтанацыйнымі практыкамі ў сістэму каляндарнага і сямейна-радавога цыклаў, устойліва функцыянуюць нароўні з узорамі «фальклорнага» ўзроўню, набываюць музычна маркіруючую функцыю, «азначваюць» адпаведныя перыяды гадавога абрадавага кола, выступаюць складальнікам музычнага кода пахавальнага абраду.

Этнафанійныя версіі, якія ўзнікаюць як вынік «прачытання» (увасаблення) гімнаграфіі праваслаўнага богаслужэння традыцыйнымі вясковымі спевакамі, раскрываюць шырокі спектр вуснатрадыцыйных трансфармацый многіх кананічных абіходных песнапенняў як на вербальным, структурна-кампазіцыйным, так і музычна-рытмавым, гукавышынным, тэмбравым узроўнях. Трапары, кандакі, каноны, сціхіры і іншыя паўстаюць пры гэтым для спевакоў «сваімі», неабходнымі, хоць і не губляюць «высакародства паходжання» як тыя, што прыйшлі з храма – месца святога, «неба на зямлі».

Беларуская кампазітарская творчасць апошніх дзесяцігоддзяў XX – пачатку XXI ст. нясе на сваіх штандарах прагу духоўнасці праз дакрананне да рэлігійных каштоўнасцей. Сведчанне таму – дастаткова выразная лінія музычных «перакладаў» кананічных тэкстаў богаслужэння. Корпус кампазітарскіх твораў, якія сведчаць пра спробы музычнага ўвасаблення праваслаўнай гімнаграфіі, належыць дастаткова шырокай групе



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускіх творцаў. Сярод іх – айцец Андрэй (Бандарэнка), М. Васючкоў, Л. Шлег, А. Хадоска, А. Залётнеў, С. Бельцюкоў, В. Кузняцоў, С. Бугасаў, А. Даньшова, А. Іваноў, Г. Кароткіна і інш.

Версіі кананічных царкоўных песнапенняў, якія прапануе беларуская кампазітарская практыка канца XX – пачатку XXI ст., адлюстроўваюць не толькі індывідуальнасць аўтарскіх стыляў, але і супрацьлегласць творчых падыходаў да гімнаграфіі праваслаўнага богаслужэння, адметнасць у ступені адпаведнасці пеўчым канонам праваслаўнай традыцыі, палярнасць у арыентацыі на гукастылявыя законы храма як сакральнай прасторы, або на гукаэталоны, аб'яднаныя ў тапахроне канцэртнай залы.

Запатрабаваныя ў розных асяродках духоўна-рэлігійнага і сацыяльна-культурнага жыцця праваслаўныя песнапенні – неад'емны складнік беларускай музычнай культуры канца XX – пачатку XXI ст., адзін з магутных і вызначальных яе кампанентаў. Маркіраваныя музычнымі «перакладамі» гімнаграфічных тэкстаў пеўчыя стылі царкоўнай традыцыі, сфера акадэмічнага канцэртнага выканальніцтва, вуснатрадыцыйныя песенныя практыкі, кампазітарская творчасць утвараюць нелінейную цэласнасць, якая ў чарговы раз сведчыць, што гімнаграфія праваслаўнага богаслужэння невычэрпная ў сваім хранатопе, а Святое слова аб'ядноўвае ўсе стылі музыкі.

## БЕЛОРУССКАЯ ФОРТЕПЬЯННАЯ ШКОЛА: ОСОБЕННОСТИ СТАНОВЛЕНИЯ И РАЗВИТИЯ

***О. Г. Шевченко,***
*кандидат искусствоведения, доцент, заведующий кафедрой хорового дирижирования и инструментального исполнительства Могилевского филиала УО «Белорусская государственная академия музыки»*

Особенности динамичного развития и значительные творческие успехи белорусской фортепьянной школы в современный период обусловлены многими факторами. Рассматривая феномен фортепьянной школы сквозь призму исторического видения, необходимо прежде всего указать на многогранность трактовки данного термина. В узком смысле понятие «фортепьянная школа» традиционно ассоциируется с определенным



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ